# «Зямлі маёй родная мова»



**Віртуальная выстава (да Міжнароднага дня роднай мовы)**

Максім Танк



Родная мова
З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор’яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова.
Няма на зямлі таго шчасця і гора,
Якога б ты нам перадаць не магла.
Няма такіх нетраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на радзіму, туды, дзе сягоння
Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй
Над спаленай хатай, над родным загонам,
Над будучыняй і над песняй маёй, —
Над тым, што было і што век будзе вольным.

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.
Калі ж ападзе і развеецца дым
І нівы васкросшыя закаласяцца, —
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазвініш ты у кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сярэбраны гром
І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці.

**Міжнародны дзень роднай мовы** — заснаваны рашэннем 30-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў лістападзе 1999 года і адзначаецца 21 лютага з 2000 года штогод з мэтай абароны моўнай і культурнай разнастайнасці.

Дата супадае з Днём руху за бенгальскую мову, які адзначаецца ў Бангладэш як зень памяці аб крывавых падзеях 1952 года — дзень, калі пакістанская паліцыя расправілася з прыхільнікамі прызнання бенгальскай мовы ў якасці афіцыйнай мовы ва Усходнім Пакістане (Бангладэш з 1971 года).

Генеральная Асамблея ААН падтрымала рашэнне аб аб'яўленні Міжнароднага дня роднай мовы і заклікала дзяржавы-членаў ААН і Сакратарыят ААН спрыяць абароне і захаванню ўсіх моў народаў свету.








Беларуская мова — жывая мова. Гэта галоўны сродак нацыянальнай культуры Беларусі, які адкрывае кожнаму з нас вялікі і чароўны свет мілагучнасці і самабытнасці.

Нацыянальная мова напоўнена мноствам эпітэтаў і характарыстык. Мабыць, няма ніводнага беларускага пісьменніка, які не выказаў бы свайго зачаравання роднай мовай. Вялікую ролю ў фарміраванні беларускай літаратурнай мовы адыгралі Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч і многія іншыя пісьменнікі Беларусі.

Гэтымі аўтарамі было сказана мноства шчырых слоў пра прыгажосць і багацце беларускай мовы. Іх творы працятыя любоўю да яе, непакоем за яе лёс.



Францыск Скарына зрабіў значны ўклад у развіццё і распаўсюджванне пісьменства і культуры на тэрыторыі Беларусі. Яго найбольш значныя дасягненні ўключаюць: першая друкаваная кніга на славянскай мове, пераклад Бібліі на беларускую мову і яе выданне, заснаванне першай друкарні на тэрыторыі Усходняй Еўропы.

У 1517-1519 гг. — Францыск Скарына ў Празе надрукаваў 23 кнігі.






У Празе ён адкрыў невялікую друкарню, дзе перакладаў кнігі з царкоўнаславянскай на мову ўсходніх славян.

Першым перакладзеным творам Скарыны стаў «Псалтыр», далей выхадзец з Полацка выпусціў яшчэ больш за два дзясяткі перакладзеных кніг, якія сталі неацэнным укладам у культуру некалькіх народаў.




Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў лістападзе 2017 г. на базе бібліятэкі акадэміі прайшла сустрэча з намеснікам дырэктара па навуковай і выдавецкай дзейнасці НББ – А. А. Сушай, вядомым даследчыкам гісторыі кніжнай культуры Беларусі. Ён перадаў акадэміі ўнікальны падарунак ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны».

# Прапануем азнаёміцца з выданнямі з багатага фонду бібліятэкі акадэміі



# Навукова-папулярная літаратура, падручнікі, слоўнікі




002(47.60)
Г 576 д. з.
Говін, С. В.
Друк Заходняй Беларусі : (1921-1939 г. г.) / С. В. Говін. – Мінск : БДУ ім. У. І. Леніна, 1974.

У рабоце разглядаюцца пытанні ўзнікнення масавага дэмакратычнага друку ў Заходняй Беларусі перыяду акупацыі яе буржуазна-памешчыцкай Польшай (1921-1939 гг.), асвятляецца яго барацьба за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных заходняй Беларусі, раскрываюцца характар і ўмовы гэтай барацьбы.



002(47.60)
Ч-542 п. г.
450 год беларускага кнігадрукавання / рэд. К. К. Атраховіч (Кандрат Крапіва). – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 436 с.

У кнізе разглядаецца гісторыя кнігавыдавецкай справы Беларусі і роля выдатнага беларускага вучонага-асветніка Ф. Скарыны ў распаўсюджанні друкаванага слова. Аналізуюцца кнігі Скарыны з боку мовы.






008
Д 857 с. ф.
Духоўная спадчына Ф. Скарыны: гісторыя і сучаснасць : сборник статей по материалам Международной научно-практической конференции студентов и магистрантов, Горки, 18 мая 2017 г. / Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Главное управление образования, науки и кадров, Белорусская государственная сельскохозяйственная академия ; ред.: Н. С. Шатравко, Г. А. Гусарова, А. И. Малько. – Горки : [б. и.], 2017. – 212 с.

Рассматриваются актуальные проблемы исторического и культурного наследия Беларуси, вопросы образования, воспитания, формирования духовно-нравственных ценностей современной молодежи.




491.804
К 821 с. я.

Кривчик, В. Ф.
Старословянский язык : учеб. пособие / В. Ф. Кривчик, Н. С. Можейко. – 2-е изд., доп. – Минск : Вышэйш. школа, 1974. – 303 с.

Кратко излагаются некоторые синтаксические и лексические особенности старославянского языка. В приложении даются тексты, задания к ним и словарь наиболее употребительных старославянских слов. При сравнительно-историческом анализе фонетических и морфологических явлений авторы стремились привлекать данные современного белорусского языка.




491.72
К 269 б. / 1
Карский, Е. Ф.
Белорусы : в 3-х т. / Е. Ф. Карский. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006.

Т. 1 : Введение в изучение языка и народной словесности. – 653 с. – (Помнікі гістарычнай думкі Беларусі).




398(47.60)03)
Б 43 ф.
Беларускі фальклор : энцыклапедыя. У 2-х т. Т. 1. Акапэла-Куцця / рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005. – 765 с.

Энцыклапедыя «Беларускі фальклор» — першае ў гісторыі наыцянальнай культуры галіновае навукова-даведачнае выданне, якое шырока асвятляе пытанні духоўнай культуры беларусаў. Выданне ставіць за мэту адлбстраваць усё багацце і непаўторнасць мастацкай творчасці беларускага народа, разнастайнасць яе відаў і жанраў, створаных паэтычным словам вобразаў.




394(47.60)
Л 659 с. і.
Ліцьвінка, В. Д.
Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 1997. – 189. с.

У кнізе падаюцца чатырнаццаць свят і абрадаў беларусаў, многія з якіх — упершыню. Найболын разгорнута прадстаўлены асноўныя з іх: Вялікдзень, Купалле, Дзяды, Каляды. Даюцца метадычныя парады па арганізацыі іх святкавання, рэкамендуецца адпаведная літаратура.




008(47.60)09)
Л 889 г. к.

Лыч, Л. М.

Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

У гістарычным плане раскрыты шлях, які прайшла культура Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён. Праблема асветлена ў цеснай сувязі з эканамічнай і палітычнай гісторыяй Беларусі і тымі культурнымі працэсамі, што адбываліся ў суседніх краінах, а таксама ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе. Асноўнае месца адведзена паказу дзяржаўнай палітыкі ў сферы мовы. Культурны працэс у Беларусі даследаваны праз канкрэтную дзейнасць славутых асветнікаў, пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў і іншых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі.




491.72
А 13 к. б.
Абабурка, М.
Культура беларускай мовы / М. Абабурка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1994. – 121 с.

Разглядаюцца пытанні правільнасці, дакладнасці, лагічнасці, чысціні, багацця і выразнасці мовы (маўлення) як сродку вуснай і пісьмовай камунікацыі паміж жыхарамі Беларусі.




008(47.60)09)
Л 889 г. к.
Лыч, Л. М.
Гісторыя культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 2-е выд., дап. – Мінск : Экаперспектыва, 1997. – 486.

У гістарычным плане раскрыты шлях, які прайшла культура Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён. Праблема асветлена ў цеснай сувязі з эканамічнайі палітычнай гісторыяй Беларусі і тымі культурнымі працэсамі, што адбываліся ў суседніх краінах, а таксама ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе. Асноўнае месца адведзена паказу дзяржаўнай палітыкі ў сферы мовы. Культурны працэс у Беларусі даследаваны праз канкрэтную дзейнасць славутых асветнікаў, пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў і іншых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі.




491.72(03)
З-132 с. с.
Завальнюк, У. М.
Слоўнік сучаснай беларускай мовы / У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч ; ред.: М. Р. Прыгодзіч, У. М. Завальнюк. – Мінск : Народная асвета, 2009. – 399 с.

Слоўнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».




491.72(03)
П 396 с. ц.
Плотнікаў, Б. А.
Слоўнік цяжкасцяў беларускай мовы / Б. А. Плотнікаў, В. П. Трайкоўская . – Мінск : Кніжны дом, 2004. – 543 с.

У кнізе сцісла абагульнены цяжкасці беларускай мовы ў галіне арфаэпіі і арфаграфіі, марфалогі, у прыватнасці ва ўжыванні склонавых канчаткаў назоўнікаў, у сінтаксічным кіраванні дзеясловаў, у функцыях знакаў прыпынку, у сінтаксісе, лексікалогіі, фразеалогіі, стылістыцы.

# Мастацкая літаратура




928(03)
Б 142 м. б.

Багдановіч, М. А.

Максім Багдановіч : энцыклапедыя / М. А. Багдановіч ; склад.: І. У. Саламевіч, М. В. Трус ; гал. рэд. Т. У. Бялова ; рэд. А. В. Праляскоўскі [и др.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2011. – 607 с.

«Максім Багдановіч» — персанальная энцыклапедыя, якая асвятляе жыццё і творчасць класіка беларускай літаратуры. У ёй змешчаны артыкулы, прысвечаныя лірычным творам паэта, перакладам, крытыцы, публіцыстыцы, паасобным жанрам, вобразам, артыкулы пра яго эстэтычныя погляды, сувязі з фальклорам і літаратурамі замежных краін, пра ўвасабленне багдановічаўскай тэмы ў выяўленчым мастацтве, музыцы, тэатры, кіно.




С(Бел)
Б 142 в.

Багдановіч, М.
Выбранае / М. Багдановіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. – 192 с.

Паэзія Максіма Багдановіча вызначаецца высокім грамадзянскім пафасам, глыбокім роздумам аб жыцці і каханні, непасрэднасцю і шчырасцю пачуццяў. У кнізе сабраны лепшыя творы паэта.




С(Бел)
Б 24 к.
Барадулін, Р.
Ксты : вершы / Р. Барадулін ; уклад.: У. Завальнюк, А. Сакалоўская. – 3-е выд., дап. – Мінск : Рымска-Каталіцкая парафія святога Сымона і святой Алены, 2009. – 527 с.

Кніга вучыць любіць бліжняга, спагадаць яму.




C(Бел)
Б 24 а.
Барадулін, Р.
Anima : вершы / Р. Барадулін. – Мінск : Рымска-Каталіцкая парафія святога Сымона і святой Алены, 2011. – 452 с.

Anima - па-латыні «душа». Душа вечная, бо яна ўдыхнута ў чалавека Усявышнім. Душа, дух, дыханне. Усё з душой жывое, без душы мёртвае.




С(Бел)
Б 268 ш. з.
Баршчэўскі, Я.
Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях : пер. с пол. / Я. Баршчэўскі ; уклад., пер., аўт. камент. М. Хаўстовіч ; маст. В. Славук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 383 с. : іл. – (Спадчына).

Кнігу аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Яна Баршчэўскага (1790 г. ці 1794-1851 гг.) «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» параўноўваюць з сусветна вядомым казачным эпасам «Тысяча і адна ноч». Напісаны па-польску ў той час, калі нават сама назва «Беларусь» была пад забаронаю, фантастычныя апавяданні Я. Баршчэўскага неслі магутны зарад беларускае нацыянальнае ідэі.




С(бел)
Б 953 з. т. / 1
Быкаў, В. У.
Збор твораў : у шасці тамах / В. У. Быкаў. – Мінск : Мастацкая літ.
Т. 1 : аповесці, апавяданне / аўт. прадм. М. Тычына. – 1992. – 483 с.

У першы том Збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава ўвайшлі аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Дажыць да світання» і апавяданне «Сваякі».




С(Бел)
К 215 з. т. / 8, 2
Караткевіч, У. С.
Збор твораў : у васьмі тамах / У. С. Караткевіч ; рэд. Андраюк [і інш.]. – Мінск : Мастацкая літаратура.
Т. 8, Кн. 2 : З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытыка, інтэрв'ю, летапіс жыцця і творчасці / рэд. А. І. Мальдзіс; уклад. Л. Д. Багданава. – 1991. – 495 с.

У заключны том Збору твораў У. Караткевіча ўвайшлі нарысы, эсэ, публіцыстычныя і крытычныя артыкулы, рэцэнзіі і інтэрв'ю. Яны напісаны ярка, страсна, з любоўю да роднай Беларусі, яе літаратуры, людзей, якія пакінулі след у жыцці пісьменніка.




928
К 215 ж. і.
Караткевіч, У. С.
Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : партрэт пісьменніка і чалавека / У. С. Караткевіч, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2010. – 207 с.

Уладзімір Караткевіч, легендарны беларускі раманцік, апярэджваў свой час, узняўся над канфармізмам, над паўсядзённасцю і бездухоўнасцю да вышыняў, з якіх добра відаць шляхі, што лучаць мінулае з будучыняй, чалавека з людзьмі і народамі.




С(Бел)
К 60 в.
Колас, Я.
Выбранае / Я. Колас ; склад. В. Бечык. – Мінск : Мастацкая літ., 1983. – 375 с.

У кнігу класіка беларускай літаратуры ўвайшлі яго лепшыя вершы і раздзелы з паэм.




С(Бел)
К 60 н. з.
Колас, Я.
Новая зямля : паэма / Я. Колас ; мастак Р. С. Фралоў. – Мінск : Народная асвета, 1975. – 336 с.

Паэма «Новая зямля» — класічны твор нацыянальнай літаратуры, у якім глыбока адлюстраваны сацыяльныя супярэчнасці беларускай вёскі канца XIX ст., паказана паднявольнае становішча беларускага працоўнага селяніна ва ўмовах антынароднага ладу, услаўлены яго свабодалюбівыя мары і імкненні. Карціны жыцця і быту сялян дапаўняюцца выключнымі па сваёй маўляўнічасці апісаннямі беларускай прыроды.




С(Бел)
К 92 в. і.
Купала, Я.
Вершы і паэмы / Я. Купала ; маст. М. Басалыга. – Мінск : Мастацкая літ., 1982. – 431 с.

У зборнік увайшлі лепшыя ўзоры лірыкі класіка беларускай літаратуры.




С(Бел)
К 92 ж. б.
Купала, Я.
Жыве Беларусь : вершы, артыкулы / Я. Купала ; уклад., аўт. прадм., аўт. камент. В. Райгойша. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 484 с.

Кнігу склалі творы народнага песняра, прысвечаны Беларусі, яе шматпакутнай гісторыі. Сярод іх і такія сусветна вядомыя, як «А хто там ідзе?», «Спадчына» і інш., і малавядомыя або зусім невядомыя шырокаму чытачу выршы і артыкулы Я. Купалы.




891.72
Э 65 н. т.
Энеіда навыварат. Тарас на Парнасе : паэмы. – Мінск : Юнацтва, 1983. – 62 с.

«Энеіда навыварат» — адна з першых і, трэба адзначыць, удалых спроб вялікага твора на беларускай мове. «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» — дзве паэмы, якія стаялі ля вытокаў новай беларуская літаратуры, закладвалі яе падмурак і былі першымі цаглінамі ў гэтым падмурку.




821.161.3
А 881 н. д.
Арцем'еў, В. І.
Наўзбоч дарог майго жыцця : апавяданні, успаміны, публіцыстычныя нататкі / В. І. Арцем'еў. – Магілёў : [б. и.], 2019. – 88 с.

У новы зборнік ўвайшлі больш трох дзясяткаў апавяданняў і публіцыстычных нататкаў розных гадоў пра набалелае і перажытае, якое і сёння мае сацыяльна-грамадскае запатрабаванне. Кніга прызначана работнікам культуры, аматарам краязнаўства, настаўнікам і студэнтам – увогуле шырокаму колу чытачоў.




821.161.3
Б 129 а.
Бабчанок, Р. У.
Асалода : паэтычны зборнік палескага хлебароба / Р. У. Бабчанок. – Мінск : Бонэм, 2012. – 96 с.

Як сейбіт шчодра ўвіхаецца на веснавой ніве, так і Рыгор Уладзіміравіч сваімі вершамі засявае духоўную раллю вёскі, якая прарастае шчодрым ураджаем людской дабрыні, шчырасці і павагі да сялянскай працы.




821.161.3
К 326 в.
Кветкавыя ветразі / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ; рэд. А. М. Зэкаў ; склад. І. С. Шкіронак. – Мінск : БДУ, 2016. – 143 с.

У літаратурны зборнік «Кветкавыя ветразі» ўвайшлі творы ўдзельнікаў клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа», які створаны пры Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтарамі першага клубаўскага зборніка сталі студэнты некаторых факультэтаў БДУ. Яны спрабуюць свае сілы ў розных літаратурных жанрах. Гэта вершы, апавяданні, казкі, нарысы. У сваіх творах удзельнікі клуба закранаюць пытанні, якія хвалююць іх душы: ад асабістых інтымных перажыванняў да набалелых праблем чалавецтва.




С(Бел)
Г 67 к.
Горацкія крыніцы : зборнік вершаў / рэд. Л. Г. Васільеў [и др.] ; маст.: А. Я. Бруй, Т. А. Гаўрыленка, А. С. Шаўцоў. – Горкі : [б. и.], 2005. – 85 с.

Перад чытачамі першы паэтычны зборнік горацкіх аматараў літаратурнага слова на беларускай мове «Горацкія крыніцы». Напэўна, кожны, хто валодае ўменнем выказаць свае думкі паэтычным словам, жадае, каб яго вершы былі заўважаны, прыняты. Гэты зборнік дае магчымасць аўтарам, у большасці непрафесійным, данесці да чытача свае думкі аб радзіме, гісторыі, роднай мове, маралі, каханні. Вершы, сабраныя ў гэтай кнізе, належаць людзям розных узростаў, заняткаў, адукацыі.




821.161.3=030
А 664 с. д.
Андрэева, Л. А.
Сугучнасць душ... Сугучнасць слоў... : пераклады / Л. А. Андрэева. – Мінск : Белпрынт, 2019. – 136 с.

Ў кнігу ўвайшлі дапрацаваныя і дапоўненыя пераклады з рускай мовы больш як 60 аўтараў, арыгіналы твораў якіх напісаны не толькі на рускай мове, але і іншых мовах. Некаторыя з іх вядомы чытачу па раней выдадзеных аўтарам кнігах («І боль, і слёзы, і любоў», «Цвіла каліна», «Ніці»).




С(Бел)
К 502 м. п.
Клок, А.
Мікітавы прыгоды : паэма / А. Клок ; мастак. Т. Р. Юркова. – Горкі : Аддзел культуры Горацкага райвыканкама, 2000. – 151 с.

Паэма адлюстроўвае жыццё беларускай вёскі ў 60-я гады адыходзяага 20-га стагоддзя.

Мае гістарычна-сатырычны кірунак з выкарыстаннем моўнага асяроддзя Уходняй Беларусі.




821.161.3
С 362 ж. к.
Сілівестрава-Мажугіна, В.
Жыццёвы карабель : зборнік вершаў / В. Сілівестрава-Мажугіна. – Узда : [б. и.], 2015. – 75 с.

Зноў новая кніжка паэткі Валянціны Сілівестравай-Мажугінай «Жыццёвы карабель» пабачыла свет. Яе вершы як лірычнай, так і духоўна-патрыятычнай накіраванасці кранаюць сваёй узнёсласцю і душэўнай прастатой. Шмат у іх цёплай, сардэчнай патрыёткі, прызнання ў любові прыродзе, сваім землякам, сябрам. Асобны раздзел займаюць творы на духоўную тэматыку. Чытаючы іх, разумееш, што храм Божы, той самы надзейны прычал, які дапаможа ўратаваць душу.

# «Зямлі маёй родная мова»




**Віртуальную выставу падрыхтавала бібліятэкар 2-й катэгорыі Лапцева Л. Д.**